УДК 316.334.2

**К.І. Князева, аспірантка кафедры сацыялогіі, Бел. дзярж. універсітэт, Мінск**

# СЕТКА ЯК АРГАНІЗАЦЫЙНЫ ПРЫНЦЫП

Рэаліі сучаснага жыцця – развіццё новых інфармацыйных тэхналогій, змена спосабаў вытворачасці, укараненне вытворчых адносін новага тыпу – непазбежна вядуць да змянення і пераўтварэння грамадскіх адносін. Традыцыйныя іерархічныя і бюракратычныя формы арганізацыі і кіравання ў многіх выпадках ўжо не адпавядаюць узрослым патрабаванням да сучасных прадпрыемстваў адносна іх магчымасці да хуткіх змяненняў, навучанню і мадэрнізацыі. Узнікае тэндэнцыя да з’яўлення новых арганізацыйных форм – сеткавых арганізацый, якія адрозніваюцца высокім дынамізмам і ніяк не адпавядаюць традыцыйнаму ўяўленню аб вытворчым прадпрыемстве. Для іх характэрныя гібкасць, спецыялізацыя і акцэнт на кіраванне ўзаемаадносінамі і сувязямі, а не рыначнымі трансакцыямі [6].

У сувязі з гэтым мяняецца і роля сеткавай арганізацыі – калі раней яна была адлюстраваннем толькі ўнутранай структуры працэсу кіравання, яго зместам, то ў навейшым светабудаўніцтве яна адыгрывае ключавую ролю і становіцца свядома ўкараняемай формай арганізацыі кіравання. Найбольш відавочна гэты працэс адлюстраваны ў эканоміцы новага грамадства, якую ўсё часцей даследчыкі называюць «сеткавай эканомікай» [гл. напр. 4, 5, 7], у выглядзе рэарганізацыі структур сучасных прадпрыемстваў.

Сеткавая форма арганізацыі з’яўляецца натуральным чыннікам эканамічнага і сацыяльнага асяроддзя і ўяўляе форму рыначнага ўзаемадзеяння гаспадарчых суб’ектаў, якая актыўна развіваецца. Гэтая форма існуе побач з іншымі арганізацыйнымі формамі і ўляе іншы механізм каардынацыі ў адрозненне ад іерархічнага.

У межах сацыялогіі вывучэнне феномена сеткавай арганізацыі і працэсаў, якія адбываюцца ў сетках і вызначаюць іх канкурэнтаздольнасць, вядзецца пераважна з пачатку 90-х гадоў. Развіццю дадзенага напрамку ў тэарэтычнай сацыялогіі ў большай ступені садзейнічала фундаментальная праца Мануэля Кастэльса, прафесара Каліфарнійскага універсітэта (Берклі, ЗША) і дырэктара Інстытута даследаванняў краін Заходняй Еўропы, “Інфармацыйная эпоха: эканоміка, грамадства, культура”.

Пункт гледжання аўтара наступны. Сеткавыя адносіны, сеткавая арганізацыя грамадства існавала заўсёды, пры гэтым сеткавая арганізацыя дапаўняла рытуальную

іерархічную. За апошнія 10–20 гадоў у эканоміцы і вытворчасці былі распрацаваны такія арганізацыйныя схемы, якія засноўваліся пераважна на сеткавых адносінах, а не на іерархічных. У многім гэта стала магчымым дзякуючы наступленню інфармацыйнай эпохі. Сеткавая арганізацыя больш мабільная, чым іерархічная, яна больш падыходзіць для адэкватнай апрацоўкі інфармацыйных патокаў. Гэта і выводзіць сеткавыя прынцыпы арганізацыі на першы план, таму што ў сучасным свеце, па вядомаму выказванню Кастэльса, улада патокаў інфармацыі пераважае над патокамі ўлады [1].

На думку Кастэльса, мы жывём у новай эканоміцы, якая ў літаральным сэнсе слова ахоплена сеткамі. Аўтар выдзяляе і апісвае некалькі відаў сеткавых фарміраванняў, якія эффектыўна функцыянуюць у галіне эканомікі – субпадрадныя сеткі з цэнтрам у буйных прадпрыемствах, сеткі дробных і сярэдніх прадпрыемстваў, карпаратыўныя альянсы буйных прадпрыемстваў. Абагульняючы эмпірычныя дадзеныя, М.Кастэльс робіць выснову: новай глабальнай эканоміцы ўласціва свая арганіцацыйная форма прадпрыемства. Гэта «*сеткавое прадпрыемства*», якое вызначаецца як «спецыфічная форма прадпрыемства, сістэма сродкаў якога складзена шляхам перакрыжавання сегментаў аўтаномных сістэм мэтаў» [5, с.234]. Гэта сістэма інтэгрыруе розныя гаспадарчыя суб’екты, якія ў той жа час не губляюць аўтаноміі і могуць, напрыклад, удзельнічаць у рабоце іншых сетак, з’яўляцца сродкамі іншых мэтаў. Такім чынам, уключэнне ў сетку становіцца рашаючай умовай выжывання прадпрыемства.

Сеткавая арганізацыя дазваляе больш эфектыўна утылізаваць спецыфічныя перавагі асобных дзяржаўных пераўтварэнняў, зводзячы да мінімуму выдаткі і не звязваючы сябе з імі поўнай адказнасцю. Напрыклад, можна ствараць асноўныя фонды ў краінах «трэцяга свету» з таннай рабочай сілай альбо будаваць «брудныя» вытворчасці там, дзе дзяржава не надта моцна клапоціцца аб экалогіі. Пры гэтым банкаўскія рахункі размяшчаюцца ў афшорных зонах, а штаб-кватэра размяшчаецца ў адным з сусветных цэнтраў – Нью-Йорку, Лондане, Токіо ці Лос-Анджэлесе [3, с.245].

Кастэльс робіць выснову, што сеткавыя арганізацыі, здольныя генерыраваць веды і эфектыўна апрацоўваць інфармацыю; адаптавацца да зменлівай геаметрыі глабальнай эканомікі; быць дастаткова гібкімі, каб мяняць свае сродкі гэтак жа хутка, як пад уздзеяннем хуткіх культурных, тэхналагічных і інстытуцыянальных змен мяняюцца мэты; уводзіць інавацыі, паколькі інавацыя стала ключавой зброяй канкурэнтнай барацьбы, уяўляюць сабой матэрыялізацыю культуры глабальнай інфармацыйнай эканомікі [5, с.253].

Канстатаваўшы тэндэнцыю ўзрастання ролі сеткавых арганізацыйных практык у сучаснай эканоміцы, пярэйдзем да азначэння сеткавай арганізацыі і асноўных прынцыпаў функцыянавання. Як правіла, еўрапейскія даследчыкі, услед за Кастэльсам, больш схіляюцца да трактоўкі сетак як гібкіх поліцэнтрычных утварэнняў, удзел у якіх дазваляе дасягнуць пэўных канкурэнтных пераваг. У процілегласць, сярод большасці амерыканскіх даследчыкаў існуе ўяўленне сетак у выглядзе ўстойлівых структур з адзіным кантралюючым цэнтрам.

Напрыклад, як адзначаюць Ф. Катлер і Р. Ачрол: "Сеткавая арганізацыя – кааліцыя ўзаемазалежных спецыялізаваных эканамічных адзінак са сваімі мэтамі (незалежныя фірмы ці аўтаномныя арганізацыіі), якія дзейнічаюць без іерархічнага кантролю, аднак усе яны задзейнічаны ў сістэме з агульнымі мэтамі праз шматлікія гарызантальныя сувязі, узаемную залежнасць і абмен. Удзел з'яўляецца асноўным адрозненнем сеткавай канцэпцыі ад традыцыйнай тэорыі арганізацыі [4, с.46].

Як вынікае з гэтага азначэння, у такой трактоўцы сетка прадугледжвае ўжо штосьці большае, чым адносіны абмену. Элементам, які аб'ядноўвае, у такой сетцы з'яўляюцца агульныя мэты, якіх прытрымліваюцца ўсе яе ўдзельнікі. У такім выпадку для арганізацыі быць часткай сеткі азначае рэалізацыю яе доўгатэрміновай стратэгіі развіцця [6]. Галоўнае намаганне сеткавай структуры накіравана на захаванне адрозненняў паміж асобнымі партнёрамі (і тым самым разнастайнасці іх рэсурсаў) пры адначасовым прызнанні імі калектыўных каштоўнасцей і імкненні для дасягнення агульных мэтаў шляхам актыўнага ўключэння ў працэсы прыняцця рашэнняў.

*Унутрыарганізацыйныя сеткі* ахопліваюць шырокую гаму працы ў дамашніх умовах і працы з выкарыстаннем сродкаў тэлесувязі, а таксама працы з прымяненнем банкаў ведаў ці сетак ведаў. Іх агульнай прыкметай з'яўляецца аб'яднанне ў адзіную сетку асобных супрацоўнікаў з дапамогай сучасных інфармацыйных і камунікацыйных тэхналогій. Піянерамі ў гэтай частцы сеткавай арганізацыі працы з'яўляюцца кампаніі IBM, Siemens, а таксама буйныя кансультацыйныя прадпрыемствы і банкі [2].

У цяперашні час ужо працуе мноства *міжарганізацыйных дынамічных сетак*, якія выходзяць за межы аднаго прадпрыемства. Яны ўяўляюць сабой спосаб рэгулявання ўзаемазалежнасці паміж фірмамі, які, з аднаго боку адрозніваецца ад унутрыфірмавага (іерархічнага) рэгулявання, з другога – ад рыначнай каардынацыі як рэакцыі ў адказ на сігналы рынка. У той жа час, атрыбуты сеткі, такія, як працэс каардынацыі і структуры міжфірмавых кааліцый, не проста гібрыдныя формы ўнутрыфірмовых і рыначных

аналагаў, але ў сваім родзе унікальныя характарыстыкі, што ўяўляюць сабой разнастайныя іх камбінацыі [9, с.28].

Сеткавыя арганізацыіі ўяўляюць сабой адкрытыя структуры, якія могуць неабмежавана пашырацца шляхам уключэння новых вузлоў, калі тыя здольныя да камунікацыі у рамках дадзенай сеткі, гэта значыць выкарыстоўваюць аналагічныя камунікацыйныя коды (напрыклад, каштоўнасці ці вытворчыя задачы). Сеткі дэцэнтралізуюць выкананне і размяркоўваюць прыняцце рашэння. У іх няма цэнтра. Яны дзейнічаюць па бінарнай логіцы: уключэнне/выключэнне. Усё, што ўваходзіць у сетку, карысна і неабходна для яе існавання, што не ўваходзіць – не існуе з пункту гледжання сеткі, і можа быць праігнаравана ці элімінавана.

Сеткавыя сувязі у такіх структурах характарызуюцца трыма прынцыповымі рысамі, якія падкрэсліваюць іх сацыяльны характар:

1. укаранёнасцю [emdeddedness],
2. звязанасцю [connectivity]
3. рэцыпрокнасцю (узаемнасцю) [reciprocity]

Простай перадумовай сеткавага падыходу з’яўляецца меркаванне аб тым, што гаспадарчыя агенты з большай верагоднасцю ўступаюць у адносіны з тымі, з кім яны мелі справу раней, пераканаўшыся ў надзейнасці ўжо вядомых партнёраў. Іншымі словамі, яны схільныя выкарыстоўваць не выпадковыя, а структурна ўкаранёныя сувязі. Напрыклад, на думку Гранаветэра, спецыфіка арганізацыі вытворчасці электраэнергіі ЗША ў першай палове XX стагоддзя была абумоўлена той роллю, якую адыграла кола знаёмых Т. Эдысона, які заклаў асновы электратэхнічнай прамысловасці [7, с.84]. У выніку рынак у значнай ступені складваецца з дзеянняў не аўтаномных у адносінах адзін да аднаго гаспадарчых агентаў. Яны знаходзяцца ў адносінах звязанасці і ўзаемазвязанасці, а менавіта гэтыя якасці робяць рынак устойлівым. Гэта таксама азначае, што, арганізуючы свае трансакцыі, удзельнікі рынка зыходзяць не з вузкаэгаістычнага інтарэсу, які праяўляецца ў чаканні кампенсацыі выдаткаў і атрымання выгады па прынцыпе “зараз і тут”, але на прынцыпах узаемнасці, калі выгада можа быць атрымана ў будучым, прычым у іншай, неэквівалентнай форме і, у дадатак, ад другіх агентаў сеткавага згуртавання [8, с.34].

Сеткі з’яўляюцца надзвычай старой формай сацыяльнай арганізацыі, але ў інфармацыйную эпоху яны становяцца інфармацыйнымі сеткамі, узмоцненымі інфармацыйнымі тэхналогіямі. Сеткі маюць перавагу перад традыцыйнымі іерархічна

арганізаванымі марфалагічнымі сувязямі. Акрамя таго, яны больш рухомыя і адаптаваныя формы арганізацыі, здольныя развівацца разам са сваім акружэннем і эвалюцыяй вузлоў, якія складаюць сеткі. Аднак у іх маюцца складанасці ў каардынаванні функцый, у сканцэнтраванні рэсурсаў на пэўнай мэце, у кіраванні рашэннем складаных задач за рамкамі вызначанага памера сетак. Тым не менш, гэтыя тэхналогіі паспяхова вырашаюць праблемы каардынацыі і складанасці ў інтэрактыўных сістэмах з адваротнай сувяззю і камунікацыяй узораў паўсюль унутры сеткі. Яны ствараюць беспрэцэдэнтнае спалучэнне рухомасці і магчымасці выканання задач, скаардынаванага прыняцця рашэння і дэцэнтралізаванага выканання, якія забяспечваюць у вышэйшай ступені складаную сацыяльную марфалогію і самы высокі ўзровень арганізацыі для ўсіх сацыяльных дзеянняў [5, с.78].

Паспрабуем вызначыць дакладныя адрозненні і сістэматызаваць разважанні аб сеткавай арганізацыі ў выглядзе табліцы, у якой параўнальны аналіз паміж “культурай іерархіі – вертыкальнай” і “сеткавай культурай – гарызантальнай уяўляецца найбольш наглядным.

Табліца

| **Іерархія прадугледжвае** | **Сетка прадугледжвае** |
|---|---|
| Адзінаначалле (у кожнага члена арганізацыі свой начальнік) | Шматначалле (у кожнага члена арганізацыі некалькі начальнікаў) |
| Жорсткая функцыянальная спецыялізацыя | Дынамічная, не выразная функцыянальная спецыялізацыя |
| Пераважная роля “вертыкальных” узаемадзеянняў | Пераважная роля “гарызантальных” узаемадзеянняў |
| Жорсткае кіраванне | Каардынацыю, а не кіраванне |
| Нагадвае “механізм” | Нагадвае “арганізм” |
| Структуру, канструкцыю | Адсутнасць жорсткай структуры |
| Стабільнасць, паступальнае развіццё | Мабільнасць, дынамічнае развіццё |
| Перавага моцных сувязей | Перавага слабых сувязей |
| Непасрэдны ўплыў на аб’ект уздзеяння | Апасродкаваны ўплыў, які ажыццяўляецца праз структуру агентаў |

Павышаную эфектыўнасць і выніковасць дзейнасці ў рамках сеткавай арганізацыі забяспечвае феномен “*сеткавага рычага*”. Механізм яго дзейнасці просты: кожны з членаў сеткі мае некаторы, дастаткова абмежаваны, але якасны рэсурс канкрэтнага тыпу. Кожны член сеткі прадастаўляе ў распараджэнне сеткі непасрэдна або патэнцыяльна ўвесь рэсурс або яго частку. У выніку фарміруецца агульнасеткавы патэнцыяльна адзіны рэсурс, наяўнасць якога дазваляе кожнаму члену сеткі будаваць адносіны са сваім кліентам

зыходзячы з наяўнасці ў яго распараджэнні ўсяго агульнасеткавага аб'ёму дадзенага рэсурсу. Абгрунтаванасць такога падыходу абапіраецца на функцыянальную канвенцыю, якая заключаецца ўсімі членамі сеткі, аб прадастаўленні сваёй часткі грамадскага рэсурсу ў распараджэнне любога з членаў сеткі на загадзя абгавораных умовах. Прадастаўляючы для фарміравання карпаратыўнага рэсурсу частку свайго асабістага рэсурсу праз дамоўленасць аб парадку яго выкарыстання ў выпадку неабходнасці, кожны член сеткі атрымлівае ва ўласнае распараджэнне значна большы аб'ём карпаратыўнага рэсурсу [10, с.11].

Сеткавая эканоміка, заснаваная на новых арганізацыйных формах, якая стала арганічнай часткай працэсу цэласнага пераўтварэння заходняга соцыуму, з'явілася з гэтага пункту погляду той агульнай канкурэнтнай перавагай, якую прад'явіў Захад усяму свету. Сёння не зусім яшчэ зразумела, у якіх галінах і культурных кантэкстах апраўдаюць сябе і будуць уведзены ў дзеянне сеткавыя арганізацыйныя формы ў нашай краіне. Аднак у любым выпадку мае сэнс удзяліць павышаную ўвагу этапу іх зараджэння.

## ЛІТАРАТУРА:


1. Бианки В.А. Психологические аспекты функционирования власти в сетевых структурах [Электрон. ресурс] – Режим доступа: http://img.rosbalt.ru/files/Bianki_85
2. Вютрих А., Филипп Х. Виртуализация как возможный путь развития управления [Электрон. ресурс] – Режим доступа: http://www.ptpu.ru/issues/5_99/19_5_99.htm.
3. Закамулин А.И. Субъектность сетевых структур (размышления о социологической теории М. Кастельса) // Социально-гуманитарные знания. М., 2003. №4. С. 242-256
4. Котлер Ф., Ачрол Р. Маркетинг в условиях сетевой экономики. // Маркетинг и маркетинговые исследования в России. 2000, №2. С.45-52
5. Кастельс М. Информационная эпоха: экономика, общество, культура / Пер. с англ. под науч. ред. О.И. Шкаратана. М., 2000.
6. Мирошниченко Н.В. Сетевые формы межфирменной кооперации. Подходы к определению феномена [Электрон. ресурс] – Режим доступа: http://www.ecsocman.edu.ru/db/msg/151502
7. Олейник А. Модель сетевого капитализма // Вопросы экономики. М., 2003, № 8. С.132-149
8. Радаев В.В. Социология рынков: к формированию нового направления, М., 2003.
9. Третьяк О., Румянцева М. Сетевые формы межфирменной кооперации: подходы к объяснению феномена // Российский журнал менеджмента. 2003, Т. 1. №2. С. 25-50
10. Шадрин А.Е. Информационные технологии: вклад в социальный капитал // Информационное общество. М., 2002. № 1. С. 8-12.